Зацвярджаю

Намеснік старшыні
арганізацыйнага камітэта,
намеснік Міністра адукацыі
____________ Р.С. Сідарэнка

«11» студзеня 2017 года

# ТРЭЦІ ЭТАП XXXIV РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

## КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

**11 клас**

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Варыянт І**

**Заданне 1.** Вызначце, на які склад прыпадае націск у формах назоўнага склону прыведзеных у табліцы слоў, калі яны ўжываюцца ў множным ліку і ў спалучэнні з лічэбнікамі *два (дзве)*, *тры*, *чатыры*. Парадкавы нумар націскнога склада ў словаформе і літару, што абазначае націскны гук, запішыце ў адпаведным слупку паводле ўзору, паказанага для слова *качарга*.

*Максімальная колькасць балаў – 4* (0,5 бала – за кожны правільны адказ).

| **Адзіночны лік** | **Множны лік** | **З лічэбнікамі** ***2, 3, 4*** |
|---|---|---|
| **Узор:** ***качарга*** | **2, э** | **3, і** |
| *поплаў* | | |
| *верацяно* | | |
| *ліфт* | | |
| *пяро* | | |

**Заданне 2.** З прапанаваных ніжэй слоў, ужыўшы іх у патрэбнай граматычнай форме, складзіце пяць фразеалагізмаў з кампанентам ***кот*** (таксама ў патрэбнай граматычнай форме), запісаўшы іх у правым слупку насупраць адпаведных ім значэнняў.

Словы-кампаненты для складання фразеалагізмаў: *гуляць, і, мышка, мяшок, па, прабегчы, пята, у, у, ў, укінуць, хата, чорны.*

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| | |
|---|---|
| ‘вельмі малы, невысокі, нізкарослы’ | |
| ‘той ці тое, пра вартасці якога загадзя не ведаеш; невядомае, няпэўнае’ | |
| ‘сапсаваліся адносіны паміж кім-небудзь; хто-небудзь пасварыўся з кім-небудзь’ | |
| ‘выклікаць сварку, пасварыць каго-небудзь (часцей мужа з жонкай)’ | |
| ‘хітраваць, стараючыся падмануць каго-небудзь’ | |

**Заданне** 3. Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

У самой головы оврага, в нескольких шагах от той точки, где он начинается узкой трещиной, стоит небольшая четвероугольная избушка, стоит одна, отдельно от других. Она крыта соломой, с трубой; одно окно, словно зоркий глаз, обращено к оврагу и в зимние вечера, освещенное изнутри, далеко виднеется в тусклом тумане мороза и не одному проезжему мужичку мерцает путеводной звездою *(По И. С. Тургеневу)*.

**Заданне 4**. Назавіце назвы асоб мужчынскага полу па іх значэннях. Вызначце, як утварыліся словы.

*Максімальная колькасць балаў* – *6* (0.5 бала за кожнае правільна запісанае слова, 0.5 бала за кожную правільна вызначаную ўтваральную аснову і 0.5 бала за кожны правільна вызначаны сродак словаўтварэння).

| Значэнне слова | Слова | Утваральная аснова | Сродак словаўтварэння |
|---|---|---|---|
| Узор: *'той, які танцуе'* | *танцорка* | *<u>танцор</u>* (□) | *-к-* |
| *'той, хто заступаецца за каго-небудзь, абаронца'* | | | |
| *'смелы чалавек'* | | | |
| *'акцёр, які іграе камічныя ролі'* | | | |
| *'той, хто рэгулюе рух на дарогах'* | | | |

**Заданне 5**. Дапішыце ў табліцу, дзе трэба, назоўнікі ў форме адзіночнага ці множнага ліку.

*Максімальная колькасць балаў* – *5* (1 бал за кожнае правільна запісанае слова).

| Адзіночны лік | Множны лік |
|---|---|
| | карункі |
| | блізняты |
| прасціна | |
| | даспехі |
| дно | |

**Заданне 6**. У крылатым выслоўі А. Вярцінскага *«Жыццё даецца, каб жыццё тварыць»* інфінітыў ***тварыць*** з'яўляецца выказнікам. Складзіце і запішыце сказы, у якіх інфінітыў выступае ў ролі названых членаў сказа.

*Максімальная колькасць балаў* – *4* (*1 бал за правільна складзены сказ*).

| Сінтаксічная роля | Сказ |
|---|---|
| 1. дзейнік | |
| 2. дапаўненне | |
| 3. азначэнне | |
| 4. акалічнасць | |

**Заданне 7.** Без сумнення, кожны з вас карыстаўся жартаўлівымі фразамі, пабудаванымі на спалучэнні гукаў, якія робяць цяжкім яе (фразы) вымаўленне. Іх называюць… Запішыце, як іх называюць, які моўны прыём выкарыстоўваецца пры іх стварэнні, як гэты прыём дзейнічае. Прывядзіце ўласны прыклад такой фразы.

*Максімальная колькасць балаў* – 5 (0,5 бала – за назву фразы, 0,5 бала – за моўны прыём, 2 балы – за апісанне механізму дзеяння гэтага прыёму, 1 бал – за ўласны прыклад).

**Заданне 8.** Пранумаруйце ўрыўкі з мастацкіх твораў так, каб яны размясціліся ў храналагічным парадку паводле часу напісання.

*Максімальная колькасць балаў* – 5.

№____

Слухаў хлопчык тое гранне,
Пад сабой не чуў зямлі,
Бо ў тых зыках чаравання
Спевы ўласныя плылі,
Струны сэрца ў ім дрыжалі,
Як дрыжыць бліскание зор
У надземнай цёмнай далі,
І музыкам падпявалі
I ляцелі на прастор.

№____

…На Пуцявішчы, у Панаса,
Ён там ля лазьні блізка жыў.
Што ж, чалавек ён быў рахманы,
Гарэлкі ў губы ён ня браў,
Затое ў ласцы быў у пана –
Яго пан дужа шанаваў.

вала, і – дзякуй богу. Ідзі, хлюпай пасталамі, вадзі касой мерна, роўна, справа – налева, справа – налева. Праўда, трохі цяжэй стала ісці – касу трэба амаль увесь час трымаць навісу, многа вады. Касіць тут не тое, што на сухім месцы. Запытай любога ..., і ён табе скажа, што Мокуць – чортава месца, гіблае для касца. (________________________________________)

2. Яна была больш чым проста жонкай, яна была другам да смерці. Мы жылі доўга і шчасліва, як у песні: Пакуль сонца ззяла над грэшнай зямлёю... Але яшчэ і зараз я часам бачу ў сне сівыя верасовыя пусткі, чэзлую траву на паверхні прорваў і ***, якое скача па дрыгве. Не бразгаюць цуглі, моўчкі сядзяць у сёдлах прамыя постаці коннікаў. Вецер развейвае іх валасы, плашчы, грывы коней, і самотная гострая зорка гарыць над іхнімі галовамі. ... Я прачынаюся і думаю, што не прайшоў ягоны час, пакуль ёсць цемра, голад, нераўнапраўе і цёмны жах на зямлі. Яно – сімвал усяго гэтага. Хаваючыся напалову ў тумане, імчыць над змрочнай зямлёй ***. (________________________________________)

3. Наўздагон за зніклай чарадой, з апошніх сіл перабіраючы крыллямі, не дужа высока ляцеў, быццам шкандыбаў у паветраным абшары, адсталы падбіты журавок. Ад яго амаль чалавечай роспачы аж здрыгануўся здзіўлены ***, нешта суладнае сваім затоеным пакутам пачуў ён у тым жалобным голасе, і грымаса болю і жалю скрывіла яго круглявы хлапечы твар. А журавель крычаў, кідаў у ветраны прастор дарэмныя гукі трывогі, махаў і махаў аслабелымі крыламі, пяўся наперад сваёй доўгай выгінастай шыяй, але дагнаць чародку не мог. Баец аберуч ухапіўся за галаву, зацяў вушы, напяўся, з усяе сілы сціснуўся, каб толькі стрываць. (________________________________________)

4. Увосень у Бярэзаўцы рака мялела і рана жаўцелі бярозы, – раслі на балоце. Жаўцелі заўсёды знізу, паволі, не так, як вольхі, якія чакаюць першых маразоў, тады чарнеюць і асыпаюцца за адну ноч. Цішыня стаяла ўсюды: і ля хаты, і на пасецы, і на балоце – з вёскі сюды не далятае ніводнага гуку. Затое тут жыло сваё рэха – дзень і ноч, зіму і лета, асабліва ўвосень.

(________________________________________)

5. І Серж пабег, азіраючыся, а стары чалавек доўга стаяў і ківаў галавой. Пасля ён паволі пайшоў тратуарам, звыкла сабе пакульгваючы на левую нагу і пастукваючы палкай па мокрых асфальтавых плітах. Ён дайшоў да чыгуначнага пераезда. Шлагбаум быў спушчан. Стары чалавек астаўся чакаць, пакуль пройдзе поезд. Бадай што ўжо зусім змеркла. ... Поезд прайшоў, шлагбаум падняўся, стары чалавек перайшоў праз рэйкі і ўвайшоў у глухі завулак. ... У канцы завулка стаяў трохпавярховы вялікі стары дом. У ім было многа дзвярэй і вокан. Тынк на яго сценах даўно ўжо змылі дажджы, і дом пачарнеў. Цяпер у вокнах гэтага дома свяціліся агні і з сярэдзіны чулася музыка.

(________________________________________)

№___

Улетку ён рабіў зондэрфюрэру печы. Знайшлі яго і прывялі, вядомага на ўсю ваколіцу. Пяць раніц дзяжурны жандар абшукваў яго і кожны раз аднолькава весела знаходзіў у кішэнях майстра тое самае крэсіва, самасад і кавалак чорнага хлеба. А печы атрымаліся выдатныя. Кухар хваліць пліту, а сам зондэрфюрэр – грубку з белай кафлі.

№___

Ж ы г і м о н т. Барба-а-а...
Ч о р н а я  П а н н а. Абліты цьмяным срэбрам лес і дол.
Ж ы г і м о н т. Любая...
Ч о р н а я  П а н н а. І болей не чутно птушыных песень.
Ж ы г і м о н т. Родная...
Ч о р н а я  П а н н а. Усімі зоркамі мяне цалуе ноч.

№___

Ажно пакуль камароўскі не крыкнуў ім:
– Гэта ж Ляновічыха!

Імя гэтае як бы ўсё ім растлумачыла, і яе не толькі тут жа прынялі ў шайку, але, бадай, ужо лічылі завадатаркай; каб іх арыштавала ў той час міліцыя, то, безумоўна, усе тыя смельчакі паказалі б на яе: гэта яна першая!

**Заданне 9.** Закрэсліце факты, якія вы лічыце недакладнымі.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**1.** Падчас знаходжання ў Францыі Адам Міцкевіч чытаў лекцыі ў Парыжскім універсітэце.

**2.** У арганізацыю БелАПП уваходзілі выдатныя майстры слова Казімір Сваяк, Гальяш Леўчык, Антон Навіна, Ядвігін Ш., М. Гарэцкі.

**3.** Першы купалаўскі зборнік “Жалейка” мог і не выйсці. Фундатар Аляксандр Ярэміч доўгі час думаў, якому творцу аддаць грошы. Паміж Сяргеем Ясеніным і Янкам Купалам выбраў Купалу.

**4.** Самуіла Плаўніка выключылі з ешыбота[1] праз вершы, прысвечаныя ўяўнай дзяўчыне Мірыям. Ягоную кніжку спалілі на падлозе сінагогі, а сябры адракліся ад паэта.

**5.** Радкі У. Дубоўкі *«У ветры дзікім не загінеш, // чарнобылем не зарасцеш...»* прысвечаны памяці пра Чарнобыльскую трагедыю.

**Заданне 10**. Вызначце паводле стылю аўтара і назву мастацкага тэксту.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

1. Нагам стала мокра. Спачатку вада толькі чулася, дзе пасталы ўціскалі пакошу, потым стала хлюпаць між куп'я. Неўзабаве *** ужо ўвайшоў у ваду, якая абступіла, нібы нанова абгарнула ногі. Анучы ўраз прамоклі, калошыны знізу таксама сталі мокрыя, і ногі зрабіліся важчэйшыя, быццам самі набраклі вадою. ... Цёплая

[1] ***Ешыбот*** – вышэйшая школа па падрыхтоўцы рабінаў – служыцеляў культу ў іўдаізме судздзя па пытаннях рэлігійнага і сямейнага жыцця ў яўрэйскай абшчыне.

ЗАЦВЯРДЖАЮ

Намеснік старшыні
арганізацыйнага камітэта
намеснік Міністра адукацыі

_______________ Р.С. Сідарэнка

«11» студзеня 2017 г.

ТРЭЦІ ЭТАП XXXIV РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ
ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І
«БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

## ВОДГУК НА МАСТАЦКІ ТВОР

**11 клас**

(Варыянт І)

## РАСШЫТАЕ КРЫЖЫКАМІ

Ўзору не знаю я прыгажэйшага,
Як расшытая крыжыкамі
Трыпутніку ці канюшыны,
Бацькоўскіх ці маіх босых ног –
Палявая дарога;

Як расшытая крыжыкамі мулінэ
І калісьці падораная мне
Дзяўчынай кашуля;

Як расшытае крыжыкамі крыл
Жаўрукоў,
Ластавак,
Жураўоў
Неба нада мной;

Як расшытыя крыжыкамі
Ручнікі,
Што на покуце ззяюць,
Стому з твару сціраюць
І на якіх маладым і гасцям
Мы падносім
Хлеб-соль...

Не, недарма, знаць,
Арнаментам гэтым –
А не дзідамі і арламі,
Не шаблямі і львамі –
Упрыгожвалі
Наша жыццё.

*Максім Танк (1989)*

Даведка

ВОДГУК НА МАСТАЦКІ ТВОР

[illegible]

(Варыянт 1)

## РАСШЫТАЕ КРЫЖЫКАМІ

| Этапы аналізу | Сродкі |
|---|---|
| **1. Фонавыя веды** аўтар, гістарычныя ўмовы, перадумовы напісання твора, этап развіцця літаратуры і творчасці пісьменніка, літаратурны кантэкст | Максім Танк, сапр.: Яўген Іванавіч Скурко (1912–1995) Дэбютаваў у друку ў 1931. Падчас навучання ў Віленскай гімназіі разам з Я. Гарохам выдаў рукапісны часопіс «Пралом», дзе пад псеўд. А. Граніт надрукаваў першыя вершы. Першы зб. «На этапах» (Вільня, 1936), апош. – «Errata» (Мінск, 1996). Твор належыць да сталага этапу творчасці. Этап развіцця літаратуры – сучасны.<br>Час напісання твора – савецкі, гарбачоўская адліга, перабудова. Пачаткі нацыянальнага адраджэння.<br>Тэматычна набліжаныя – Купала (Родныя вобразы), Колас (Мой родны кут!..), Броўка (Зямля Беларусі, Мой край азёрны), Караткевіч (Бацькаўшчына), Барадулін (На Беларусі), Гілевіч (Жыта, сосны і валуны), Гальпяровіч (Толькі птушкі могуць так любіць), Гардзей (Кветкі роднай зямлі), Законнікаў (Два лёсы), Ставер (У дарозе), Цвірка (Зноў вярнуўся я ў бацькаў свет палявы). |
| **2. Літаратуразнаўчы аналіз** род і жанр, тэма, ідэя і праблематыка, пафас, змест, сюжэт, кампазіцыя | Грамадзянская / філасофская лірыка, верлібр. Тэма роднага краю, зямлі. Ідэя – сцвярджэнне самакаштоўнасці нацыянальнага менталітэту, светаўспрымання беларуса.<br>Кампазіцыя двухчастковая: першая частка перыяд (падае асацыяцыі з вышыўкай крыжыкам), другая – просты сказ (супрацьпастаўляе жыццядайны вобраз крыжа агрэсіўным вобразам дзіды, шаблі, ільва, арла). |
| сістэма вобразаў, від, характарыстыка | Сімвал крыжа як Сусветнага Дрэва, як салярнага знака ў беларускім арнаменце (вышытая дзяўчынай кашуля), як абярэга (ручнікі на покуце ззяюць), як хрысціянскага знака на гербавай выяве вершніка. У гэтым сэнсе антаганістычнымі выступаюць геральдычныя вобразы дзіды, арла, ільва, што набліжае тэматыку верша да "Тутэйшых" Купалы.<br>Вобраз дарогі як шляху, кашулі як абярэгу, неба як месцішча душ продкаў (таму вобразы птушак, як у беларускай міфалогіі), ручнікоў на покуце як святога месца ў хаце. Сімвалічнае значэнне хлеба-солі (добразычлівасці, гасціннасці) ў супрацьпастаўленні з агрэсіўнымі сэнсамі дзіды, шаблі і г.д. |
| мастацкія сродкі: тропы, сродкі сінтаксічнай, гукавой выразнасці, метрыка | Эпітэт (босых ног, палявая дарога, падораная кашуля), метафара (ручнікі… ззяюць, стому з твару сціраюць, крыжыкамі крыл, трыпутніку), градацыя (Жаўрукоў, // Ластавак, // Журавоў – асобнымі радкамі). Паўторы арганізуюць структуру верша (Як расшытая крыжыкамі). Нягледзячы на жанр, у апошняй страфе прысутнічаюць радкі з паўнагучнай жаночай рыфмай (не дзідамі і арламі – не шаблямі і львамі), мэта – акцэнтаваць увагу чытача. |
| **3. Лінгвістычны аналіз** | У 1 страфе беларускае слова ўзор, у апошняй, дзе гаворыцца пра |

| | |
|---|---|
| лексічныя сродкі паводле актыўнасці, сферы ўжывання, паводле паходжання , эмацыянальнай афарбоўкі, семантыкі; фразеалогія | захопнікаў. – запазычанае (лац.) арнамент. |
| граматычныя сродкі: марфалагічныя, сінтаксічныя | Пераход ад асабістага ўспрымання ў пачатку верша (асабовы займеннік – падораная мне, неба нада мной, прынал. – маіх ног) да абагульнення напрыканцы (мы падносім, наша жыццё). Аднакаранёвыя словы (прыгажэйшага – упрыгожвалі) у першым і апошнім радках верша, якія "закальцоўваюць" кампазіцыю. Шэрагі назоўнікаў у Р. с. як паказчык паралелізму (Як расшытая крыжыкамі //Трыпутніку ці канюшыны, // Бацькоўскіх ці маіх босых ног; Як расшытая крыжыкамі мулінэ; Як расшытае крыжыкамі крыл // Жаўрукоў, //Ластавак, // Жуpавоў). Устаўная канструкцыя (А не дзідамі і арламі, // Не шаблямі і львамі) робіць акцэнт на ўзвышаным , узнёслым бачанні нацыянальнага сімвала праз ужыванне супраціўнага злучніка а, адмоўнай часціцы не і паралельнай будовы. Першая частка верша – перыяд, суадносны са складаназалежным сказам з дадынымі параўнальнымі часткамі. |
| уздзеянне на адчуванні | Расшытая крыжыкамі босых ног (кінестэтычны вобраз), расшытае крыжыкамі крыл, дзідамі, арламі (візуальны вобраз), маладым і гасцям мы падносім хлеб-соль (падзейна-эмацыянальны вобраз) |
| **4. Стылістычны аналіз** | Элементы народнай песні (Ручнікі, // Што на покуце ззяюць, // стому з твару сціраюць), на што ўказвае ўнутраная рыфмоўка дзеяслоўных канчаткаў, метафарычнасць, змест. |
| **5. Тэксталагічны аналіз** | Танк, М. Мой каўчэг: вершы, 1989–1992. Мінск, 1994. |

ЗАЦВЯРДЖАЮ

Намеснік старшыні
арганізацыйнага камітэта
намеснік Міністра адукацыі

_______________ Р.С. Сідарэнка

«_11_» _сакавіка_ 2017 г.

Заключны этап XXXIV Рэспубліканскай алімпіяды
па вучэбных прадметах «Беларуская мова» і
«Беларуская літаратура»

**Крытэрыі ацэнкі конкурсу «Водгук на мастацкі твор»**

*Максімальная колькасць балаў – 30*

| | |
|---|---|
| **I. УМЕННЕ ВЫЯЎЛЯЦЬ АСНОЎНУЮ ТЭМАТЫКУ І ПРАБЛЕМАТЫКУ ТВОРА, АЎТАРСКУЮ ПАЗІЦЫЮ (2 БАЛЫ)** | |
| 2 б. | *правільнае разуменне тэмы і праблемы твора, дакладнае вызначэнне і абгрунтаванне аўтарскай пазіцыі* |
| 1 б. | *няпоўнае разуменне тэмы і праблемы твора, недастаткова поўнае асвятленне аўтарскай пазіцыі* |
| 0,5 б. | *прыблізнае разуменне тэмы і праблемы твора, выяўленне асобных спосабаў раскрыцця аўтарскай пазіцыі* |
| **II. УМЕННЕ АБГРУНТОЎВАЦЬ ПРАЧЫТАНАЕ (6 БАЛАЎ)** | |
| 6 б. | *дакладнае і вычарпальнае абгрунтаванне ўласнага прачытання твора; наяўнасць чытацкага вопыту (звесткі пра аўтара, паралелі з іншымі творамі, спасылкі на іншых аўтараў, цытаты, уласныя паэтычныя радкі і інш.); дарэчнасць ілюстрацыйнага матэрыялу, яго дакладнасць, доказнасць, мэтазгоднасць, эфектыўнасць* |
| 4–5 б. | *наяўнасць цікавых назіранняў над творам, пэўнага чытацкага вопыту, эпізадычнае абгрунтаванне ўласных высноў са спасылкай на тэкст і творы іншых аўтараў* |
| 3 б. | *ацэнка асобных (2–3) аўтарскіх перакананняў, думак, разважанняў; частковае абгрунтаванне ўласнага прачытання твора* |
| 2 б. | *наяўнасць асобных цікавых назіранняў над творам без прывядзення неабходнай аргументацыі да іх* |
| 1 б. | *канстатацыя арыгінальнасці прачытанага, але адсутнасць доказаў, наяўнасць фактычных, лагічных памылак у аргументацыйнай частцы, абмежаваны чытацкі вопыт, недакладнасць, спрошчанасць асабістай ацэнкі, пераказ зместу твора, недарэчнае цытаванне твораў вядомых аўтараў* |
| **III. УМЕННЕ ВЫЗНАЧАЦЬ РОЛЮ СЮЖЭТА, КАМПАЗІЦЫІ, ВЫЯЎЛЕНЧЫХ СРОДКАЎ ВЫРАЗНАСЦІ (7 БАЛАЎ)** | |
| 7 б. | *дакладнае вызначэнне кампазіцыі твора, яго сюжэтных ліній, вобразаў, мастацкіх сродкаў выразнасці і іх цікавая, арыгінальная інтэрпрэтацыя* |

| | |
|---|---|
| 5–6 б. | *нязначныя недахопы ў інтэрпрэтацыі вобразных сродкаў і структуры тэксту* |
| 4 б. | *наяўнасць нешматлікіх (1–2) памылак у вызначэнні і інтэрпрэтацыі кампазіцыі твора, сюжэтных ліній, вобразаў, выяўленчых сродкаў* |
| 3 б. | *інтэрпрэтацыя асобных элементаў тэксту* |
| 2 б. | *павярхоўнае бачанне ролі сюжэта, кампазіцыі, вобразаў, мастацкіх сродкаў выразнасці ў раскрыцці тэмы і ідэі твора; недакладнасці ў вызначэннях* |
| 1 б. | *пералічэнне выяўленчых сродкаў без абгрунтавання іх ролі ў мастацкім творы* |

**IV. МОЎНАЕ І КАМПАЗІЦЫЙНАЕ АФАРМЛЕННЕ ВОДГУКУ (3 БАЛЫ)**

| | |
|---|---|
| 3 б. | *прадуманасць кампазіцыі (адпаведнасць кампазіцыі водгуку асаблівасцям тыпу і жанру маўлення), багацце, разнастайнасць моўных сродкаў, дакладнасць словаўжывання* |
| 2 б. | *нязначныя парушэнні кампазіцыйных частак, асобныя недахопы моўнага выражэння* |
| 1 б. | *парушэнне жанравай цэласнасці водгуку, яго структурных (адсутнасць уступу або заключэння) і стылістычных патрабаванняў; парушэнне лагічнай сувязі кампазіцыйных частак, іх несуразмернасць; недахопы моўнага выражэння (беднасць слоўнікавага запасу, русізмы, калькі, моўныя штампы)* |

**V. ПІСЬМЕННАСЦЬ (10 БАЛАЎ) –**
**ПА КРЫТЭРЫЯХ АЦЭНКІ ТВОРЧЫХ РАБОТ ВУЧНЯЎ**

| | |
|---|---|
| 1 | Больш як на 2 балы |
| 2 | ад 7/2 да 10/1 і 10 граматычных памылак |
| 3 | 0/8, 1/7, 2/6, 3/5, 4/4, 5/3, 6/2, 7/1 і 7 граматычных памылак |
| 4 | 0/7, 1/6, 2/5, 3/4, 4/3, 5/2, 6/0, 6/1 і 6 граматычных памылак |
| 5 | 0/6, 1/5, 3/3, 4/2, 5/0, 5/1 і 5 граматычных памылак |
| 6 | 0/5, 1/4, 2/3, 3/2, 4/0, 4/1 і 4 граматычныя памылкі |
| 7 | 0/4, 1/3, 2/1, 2/2, 3/0, 3/1 і 3 граматычныя памылкі |
| 8 | 2/0, 1/1, 1/2, 0/2, 0/3 і 2 граматычныя памылкі або 3 выпраўленні на месцы арфаграм (пунктаграм) |
| 9 | 1/0, 0/1 і 1 граматычная памылка, або 1–2 выпраўленні на месцы арфаграм (пунктаграм) |
| 10 | 0/0, 1/0 (нягрубая), 0/1 (нягрубая), 1–2 выпраўленні не на месцы арфаграм (пунктаграм) |

**VI. ТВОРЧЫ ХАРАКТАР РАБОТЫ (2 БАЛЫ)**

| | |
|---|---|
| 2 б. | *арыгінальнасць трактоўкі, якая не пярэчыць сутнасным характарыстыкам мастацкага твора; дакладнасць, навуковы кругагляд, наяўнасць нестандартнай формы, яе мэтазгоднасць, эфектыўнасць пры дасягненні пастаўленых камунікатыўных задач* |
| 1 б. | *наяўнасць асобнага(ых) цікавага(ых) назірання(яў), гісторыка-культурных параўнанняў, паралеляў з іншымі творамі; спрошчанасць, традыцыйнасць высноў; немэтазгоднасць абраных сродкаў і формы для вырашэння пастаўленых камунікатыўных задач* |